# Тэма кахання ў творчасці Івана Шамякіна (на матэрыяле пенталогіі "Трывожнае шчасце")

**(ОБРАЩАЕМ ВНИМАНИЕ, ЧТО НЕКОТОРЫЕ ФРАГМЕНТЫ РАБОТЫ ИЗВЛЕЧЕНЫ ИЗ ДАННОГО ДОКУМЕНТА)**

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........ 3
ГЛАВА 1 МАСТАЦКАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ КАХАННЯ Ў ПРЫГОЖЫМ ПІСЬМЕНСТВЕ ........ 6
1.1 Адлюстраванне кахання ў беларускай літаратуры ХХ ст. ........ 6
1.2 Феномен кахання ў творчасці І. Шамякіна ........ 11
ГЛАВА 2 АСАБЛІВАСЦІ АДЛЮСТРАВАННЯ КАХАННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ І. ШАМЯКІНА (на прыкладзе пенталогіі «Трывожнае шчасце») ........ 17
1.1 Аповесць «Непаўторная вясна» як гімн юнацкаму каханню ........ 17
2.2 Вернасць і абавязак у аповесцях «Начныя зарніцы» і «Агонь і снег» ........ 20
2.3 Асаблівасці адлюстравання кахання ў аповесцях «Пошукі сустрэчы» і «Мост» ........ 22
ЗАКЛЮЧЭННЕ ........ 25
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ ........ 27

# УВОДЗІНЫ

**Актуальнасць тэмы даследавання.** Тэма кахання з’яўляецца вечнай тэмай у сусветнай літаратуры. Яна ледзь не адзіная ў свеце, што не страціла свайго высокага значэння ад самых старажытных часоў да нашых дзён, прайшла скрозь стагоддзі і сёння захоўвае сваё высокае значэнне. Каханне – гэта пачатак пачаткаў. Яго прыгажосць і чысціня ва ўсе часы натхнялі дзеячаў літаратуры і мастацтва. Тэма кахання – гэта адна з асноўных і невычэрпных тэм у літаратуры. Многія паэты шукаюць сваё натхненне ва ўспамінах пра першае каханне, сям’ю, вобразы прыгожых і дарагіх сэрцу жанчын, ствараюць вершы, пішуць раманы і апавяданні, у якіх паказваюць усю прыгажосць пачуцця кахання, а таксама яго важнасць для кожнага чалавека. Гэтая тэма сустракаецца і ў творчасці выдатнага беларускага пісьменніка Івана Шамякіна.

У беларускай паэзіі асоба народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна з’яўляецца самабытнай і арыгінальнай індывідуальнасцю. У пісьменніка свой голас, сваё бачанне свету, свой стыль: яго творчасць шматколерная, глыбокая, эмацыянальная. Творы пісьменніка заўсёды вылучаліся праўдзівасцю адлюстравання падзей гісторыі жыцця краіны і грамадства: у іх узнаўляецца навакольны свет, паказваецца прыгажосць роднай зямлі, пафас стваральнай працы, выпрабаванні чалавека рознымі абставінамі.

Даследчык творчасці  пісьменніка У. У. Гніламёдаў адзначае, што менавіта “з прыходам у літаратуру І. Шамякіна зарадзіліся новыя тэндэнцыі мастацкага развіцця, а на фоне тагачаснай літаратуры, якая імкнулася да ўзвышанага апісання жыцця, па-асабліваму выглядалі яго раманы, якія вызначаліся рэалістычным паказам жыццёвых абставін, гістарычных падзей і чалавека ў іх” [10, с. 14]. М. І. Мушынскі паказвае на тое, што заслуга пісьменніка ў тым, што ён паказаў

свайго героя не ідэалізавана, а ў дакладна абумоўленай залежнасці ад абставін і часу, у цікавасці аўтара да “звычайных” праяваў жыцця [21].

Тэма кахання у творчасці Івана Шамякіна з'яўляецца адной з вызначальных. У сваіх творах ён надае шмат увагі асабістаму, інтымнаму жыццю сваіх герояў, адлюстроўвае пачуццё кахання, узаемаадносіны ў сям’і, гармонію ў чалавечых стасунках. Пачынаючы з першых раманаў “Глыбокая плынь”, “Крыніцы”, празаік настойліва пераконваў чытача, што каханне, сям’я – гэта самае трывалае апірышча чалавека, тое, што напаўняе яго жыццё сэнсам. У сваіх творах пісьменнік паказаў, што, кахаючы, чалавек пераўтвараецца, становіцца лепшым, у ім адкрываецца вялікі душэўны і духоўны патэнцыял.

Сярод усіх твораў І. Шамякіна вылучаецца пенталогія “Трывожнае шчасце”, якая складаецца з пяці аповесцяў, напісаных ў перыяд з 1957 па 1965 гады. У ёй пісьменнік на аснове ўласна пражытага паказаў лёс усяго пакалення, якое прайшло праз цяжкія выпрабаванні вайны, змагаючыся на франтах з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у партызанскіх атрадах, і ў нялёгкіх пасляваенных умовах аднаўляла родны край. Пенталогія мае аўтабіяграфічны характар: яна паказвае даваенныя, ваенныя і пасляваенныя падзеі жыцця краіны і яе жыхароў. У цэнтры пенталогіі галоўныя героі Саша і Пятро, у вобразах якіх аўтар увасобіў не толькі свае ўяўленні аб асабістым шчасці, аб гармоніі асабістага і грамадскага, але і адлюстраваў цэлую эпоху ў жыцці савецкага народа.

Творчасць пісьменніка мае вялікае значэнне для беларускай літаратуры. Яе высока ацэньвалі вядомыя беларускія паэты і пісьменнікі (У. Караткевіч, В. Быкаў і інш.). Пра жыццёвы і творчы шлях Івана Шамякіна згадваецца ў беларускіх энцыклапедыях і манаграфіях па гісторыі беларускай літаратуры. Крытыкі і літаратуразнаўцы (У. Гніламёдаў, А. Бельскі, М. Тычына, Т. Шамякіна і інш.) прысвячаюць ёй навуковыя артыкулы. Нягледзечы на значную колькасць артыкулаў, прысвечаных творчасці пісьменніка, засталіся пытанні, якія патрабуюць больш грунтоўнай распрацоўкі. Адным з іх з'яўляецца тэма кахання ў

творчай спадчыне пісьменніка і асаблівасці яе адлюстравання ў пенталогіі “Трывожнае шчасце”.

**Мэта курсавой працы** – прааналізаваць адлюстраванне кахання ў творчасці Івана Шамякіна на прыкладзе пенталогіі “Трывожнае шчасце”.

Рэалізацыя мэты прадугледжвае рашэнне наступных ***задач*:**

1. Вызначыць месца тэмы кахання ў беларускай літаратуры XX ст.
2. Разгледзець ролю феномена кахання ў творах І. Шамякіна.
3. Ахарактарызаваць асаблівасці адлюстравання кахання ў пенталогіі “Трывожнае шчасце” І. Шамякіна.

**Аб’ект** даследавання – творчасць І. Шамякіна.

**Прадмет** даследавання – адлюстраванне кахання ў творчасці Івана Шамякіна на прыкладзе пенталогіі “Трывожнае шчасце”.

**Метады даследавання**: тэарэтычныя (аналіз навуковай літаратуры па тэме, сістэматызацыя, абагульненне); практычныя (аналіз літаратурных твораў).

Тэарэтычнай асновай даследавання паслужылі працы шматлікіх літаратуразнаўцаў, якія даследвалі творчасць Івана Шамякіна (В. Каваленка, І. Навуменка, У. Гніламёдаў, Т. Шамякіна і інш.).

Матэрыялам даследавання з’яўляецца пенталогія “Трывожнае шчасце”.

Структура і аб'ём курсавой працы абумоўлены яе мэтай і пастаўленымі задачамі. Праца складаецца з ўводзін, двух глаў, заключэння і спісу выкарыстаных крыніц. Агульны аб'ём працы склаў 29 старонак.

# ГЛАВА 1
# МАСТАЦКАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ КАХАННЯ Ў ПРЫГОЖЫМ ПІСЬМЕНСТВЕ

## 1.1 Адлюстраванне кахання ў беларускай літаратуры XX ст.

У сваёй дзейнасці пісьменнікі і паэты заўсёды пры выбары жанру, тэматыкі і вобразаў для свайго твора кіруюцца сваімі поглядамі, інтарэсамі ды сваім густам. Але ёсць тэма ў літаратуры, якая прысутнічае ў творчасці кожнага вядомага пісьменніка, – тэма кахання.

Каханне – спрыяльная глеба для мастака, бо без перабольшання можна сказаць, што яно творыць цуды ў чалавечай душы: здольнае цалкам змяніць чалавека, адкрыць неабсяжную глыбіню яго ўнутранага свету, дапамагае яму выявіць у сабе сілы, аб наяўнасці якіх ён сам нават не падазраваў. Але каханне, на жаль, нярэдка прыносіць пакуты і мукі, яно часцяком раніць чалавечае сэрца і выракае яго на боль непадзеленага пачуцця [20, с. 86].

Людзі па-рознаму разумеюць каханне. Па-рознаму раскрываецца тэма кахання і ў творчасці пісьменнікаў: кожны з іх шукае свой спосаб зразумець і растлумачыць гэты феномен.

Каханне – шматаспектны феномен: псіхалагічны, культурны, эстэтычны, філасофскі. Разнастайныя вызначэнні кахання адлюстроўваюць мнагамернасць гэтага феномену. Каханне лічыцца рэлігійным пачуццём, псіхалагічным станам, глыбокім інтымным пачуццём, біялагічным інстынктам, суб’ектыўным, перажываннем, відам камунікацыі і г.д. Існуе фундаментальна-традыцыйнае разуменне гэтага вечнага пачуцця як духоўнай універсаліі і нязменнай чалавечай каштоўнасці [11, с. 27].

У “Тлумачальным слоўніку беларускай мовы” І. М. Гайдукевіча, П. П. Шубы падаецца наступнае вызначэнне гэтага паняцця: “Каханне – пачуццё самаадданай і глыбокай прыхільнасці, сардэчнага цягі” [24, с. 123].

Каханне ў мастацкай літаратуры існавала заўсёды. Лірычны бок твораў – першае што прыцягвае ўвагу большасці чытачоў. Менавіта тэма кахання акрыляе, натхняе і выклікае шэраг эмоцый, якія часам бываюць вельмі супярэчлівымі. Паэты і пісьменнікі розных эпох прысвяцілі нямала сваіх твораў тэме кахання. Яны адлюстравалі свае эмоцыі і перажыванні, свае назіранні і мінулы вопыт. Лірычныя творы заўсёды поўныя пяшчоты і прыгажосці, яркімі эпітэтамі і фантастычнымі метафарамі. Мастацкая літаратура дае шырокі матэрыял для вывучэння розных аспектаў адлюстравання кахання, які выкарыстоўваецца аўтарамі для вырашэння разнастайных мастацкіх задач [9, с. 84].

Важная роля ў мастацкім асэнсаванні кахання належыць асабістаму вопыту аўтара, яго суб'ектыўнаму ўспрыманню, якое склалася ў выніку унікальных узаемаадносін. Пры гэтым можна заўважыць, што ў свядомасці пісьменнікаў розных творчых напрамкаў існуюць і праяўляюцца ў творах агульныя рысы. У сувязі з гэтым можна гаварыць аб тэме кахання як аб адной з вызначальнай тэм мастацкай літаратуры.

Тэма кахання ў літаратуры з’явілася дастаткова даўно, яшчэ ў старажытных паданнях і песнях, якія адлюстроўвалі найбольш старажытныя гледжанні чалавека на асаблівасці чалавецкіх узаемаадносін. Каханне тут з`яўляецца сімвалам жыцця, сімвалам вечнасці, вернасці, пяшчоты, самаахвярнасці. Так, напрыклад, тэма кахання адлюстравана ў бытавым абрадавым фальклоры, у вясельных і лірычных песнях.

У беларускай літаратуры XX ст. шмат паэтаў і пісьменнікаў, што прысвяцілі свае творы прыгожаму пачуццю кахання. Найперш гэтая тэма ўзнімаецца ў паэзіі. Мастакі слова адлюстроўваюць глыбокую ўнутраную сілу кахання для быцця чалавека. Каханне ў іх валодае каласальнай энергетыкай: яно змяняе чалавека,

робіць яго лепшым. Багацце і разнастайнасць унутраных пачуццяў, думак, настрояў у лірыцы кахання складае цэлы матыўна-тэматычны комплекс. Тэма і матывы кахання займаюць прыкметнае месца ў творчасці мужчын-паэтаў: Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, Ю. Голуба, К. Камейшы, М. Башлакова, А. Пісьмянкова, У. Марука, Л. Дранько-Майсюка, Г. Пашкова, Н. Гальпяровіча, Л. Пранчака, М. Шабовіча, Ф. Баторына, М. Пазнякова, К. Цыбульскага, Р. Сітніцы, В. Шніпа, А. Бадака, М. Касцюкевіча, І. Пракаповіча, М. Кандратава, Р. Малахоўскага, З. Арцюха, А. Спіцына і інш. Цікавай уяўляецца інтымная і любоўная паэзія жанчын-паэтак: Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, З. Дудзюк, М. Баравік, С. Шах, В. Русілкі, І. Багдановіч, Л. Кебіч, Т. Трафімавай, Л. Раманавай і інш. Кожны з паэтаў, раскрываючы глыбіню цудоўных чалавечых пачуццяў, услаўляе, абагаўляе свайго адзінага і непаўторнага чалавека.

Тэма кахання з’яўляецца адной з асноўных тэм творчасці М. Багдановіча. У паэта яно адлюстравана прыгожым, светлым пачуццём, якое узвышае чалавека, робіць яго лепшым, высакароднейшым. У вершы “Маладыя гады” паэт услаўляе сілу, прыгажосць чалавечых пачуццяў і ставіць філасофскія пытанні: сэнсу жыцця, прызначэння чалавека, сілу пачуццяу маладога сэрца. У рамансе “Зорка Венера” сімвалам кахання выступае Венера – краса вячэрняга неба [18, с. 84]. Высакароднае пачуццё закаханага, боль ад растання з каханым чалавекам, прызнанне у нязменнай адданасці яму па-мастацку дасканала выказаны ў “Трыялеце”. У цыкле вершаў “Мадонны” М. Багдановіч ўвасобіў сваё разуменне вобраза мадонны – ідэала высокай красы, жаноцкасці, хараства, дабрыні і чалавечнасці. У нізцы вершаў “Каханне і смерць” пераважаюць сумныя, трагічныя ноты пра згубленае каханне. Радасць кахання і пакуты пастаўленыя побач, адлюстроўваюць дуальнасць свету. Але паэт сцвярджае, што высакароднае і моцнае пачуццё кахання здольна перамагчы нават жах смерці.

Інтымная лірыка складае важкую плынь таксама і ў творчасці М. Танка. Вершы паэта пра каханне вызначаюцца вялікімі паэтычнымі вартасцямі.

Захапленне-любаванне жанчынай – асноўнае пачуццё ў такіх вершах, як “Ave Maria”, “На крутым пастаменце з граніту…”, “У Луўры”, “Неферціці”, “Венера Мілоская”, “Готыка Святой Анны”, “Пігмаліён”, “Карынфская ваза” і інш. У замілаваным поглядзе лірычнага героя няма ні каліва жарсці, гэта любаванне жаночай прыгажосцю як творам мастацтва, як найпрыгажэйшай істотай у свеце [9, с. 132].

У паэтычнай творчасці Я. Янішчыц каханне ў розных абставінах напаўняецца адметнымі, своеасаблівымі адценнямі, нюансамі, характарыстыкамі. Яно лірычнае і драматычнае, узнёслае і трагічнае, звычайнае, зямное і рамантызаванае. Каханне для паэткі – гэта не толькі шчасце і радасць надзей, якія, на жаль, не збываюцца. Якім бы складаным для лірычнай гераіні паэткі ні быў шлях у каханні, галоўным для яе застаецца духоўнасць кахання, яго чалавечнасць, маральны сэнс. Каханне і любоў складаюць галоўны эмацыянальна-сэнсавы цэнтр паэтычнага свету Я. Янішчыц [3, с. 29]. Інтымнай лірыцы прысвечаны вершы “Хвіліны пройдуць дарагія...”, “Ты пакліч мяне. Пазаві...”, “Кахаю я і ў тым мая віна” і інш.

Тэме кахання прысвечана творчасць Р. Баравіковай. На працягу ўсёй творчасці паэтэса сцвярджае, што самае дзівоснае і непаўторнае пачуццё, якім чалавек выпрабоўваецца на вернасць, сумленнасць, высакароднасць, - каханне. У паэзіі Р. Баравіковай створаны адметны жаночы лірычны характар, якому ўласцівы пачуццёвасць, дабрыня і безаглядная ахвярнасць, прага суладдзя і гармоніі [3, с. 31]. Сусвет жанчыны, які раскрываецца ў творах Р. Баравіковай, напоўнены святлом любові і кахання, гэтым пачуццём прасякнута ўся рэчаіснасць. Гэтай тэме прысвечаны вершы “Восеньскі сад”, “Я толькі пагляджу...”, “З табой даўно не гаманілі…” і інш.

П. Броўка ў вершы “Пахне чабор” таксама праспяваў гімн каханню і маладосці. Вобраз дзяўчыны “ў белай іскрыстай хусцінцы” кліча і вабіць паэта, як само юнацтва, бо па-маладому ярка выяўлена разнастайная гама пачуццяў: і

ўспаміны аб даўнім, беззваротным юнацтве, і першае каханне, што апаліла душу героя, і прыгажосць чыстай душы, яе рамантычная ўзнёсласць, і юнацкая нерашучасць, і боль страты, і дакор сабе [18, с. 231].

Ёсць творы, прысвечаныя тэме кахання і ў У. Караткевіча. Лірычны герой яго інтымных вершаў “Гісторыя з першым каханнем”, “Фантазія”, “Раманс аб расстраляным каханні” перапоўнены светлым і трывожным пачуццём, болем ад расстання, душэўным сумам, верай у вечнае незямное каханне [9, с. 114]. З радкоў твораў можна яскрава ўявіць, адчуць і перажыць абуджэнне першага пачуцця, калі на жыццёвай дарозе сустракаеш роднага, блізкага табе чалавека, легкадумнасць і сур’ёзнасць учынкаў закаханых, чысты і светлы ўспамін пра першую сустрэчу, нялёгкі боль ад расстання, разгубленасць, безнадзейнасць і адчай ад безадказнага пачуцця і інш.

У беларускай літаратуры нямала празаічных твораў, героі якіх, праходзячы праз цяжкія выпрабаванні, захавалі на ўсё жыццё першае нясмелае юнацкае пачуццё. Пачуцці Ядвісі і Лабановіча з трылогіі “На ростанях” Я. Коласа, Ганны і Васіля з “Палескай хронікі” І. Мележа, Сашы і Пятра з “Трывожнага шчасця” І. Шамякіна з’яўляюцца своеасаблівай кнігай кахання, у якой апісвatцца ўвесь спектр чалавечых узаемаадносін з іх перажываннямі [11, с. 30].

У трылогіі “На росстанях” Я. Коласа паказана юнацкае каханне, першае прыгожае пачуццё, каханне, якое было страчана. Ядвіся азарыла жыццё Лабановіча, кранула яго сэрца не спазнаным дасюль пачуццём кахання. Але, на жаль, іх шляхі разышліся. Для героя трылогіі казка знікла, знікла таямніца, і, блукаючы па шырокіх прасторах жыцця, ён згубіў сваё першае каханне, сваё шчасце.

Няспраўджанае каханне паказана ў “Палескай хроніцы” І. Мележа. Рэдкая прыгажуня, прывабная і сціплая дзяўчына з чулай душой, Ганна пяшчотна, горача і самааддана пакахала Васіля. Васіль таксама пакахаў яе. Здавалася, шчасце будзе бясконцым. Але ў жыцці ўсё склалася інакш. Першае каханне, трапяткое і

нясмелае пачуццё, абразіў Васіль. Паверыўшы ў брыдкія плёткі, ён растаптаў усё тое прыгожае, што існавала паміж імі. Не склаўся лёс у Васіля з Ганнай, скончылася цудоўная песня кахання. Але яна ўсё жыццё будзе трывожыць іх сэрцы, шчымліва нагадваючы шчаслівыя і непаўторныя дні маладосці.

Каханне Алеся Загорскага і Міхаліны Раўбіч у рамане У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім” дапамагае героям перанесці ўсё цяжкасці жыцця, пераадолець спакусы лёсу і застацца вернымі самім сабе і ўзаемнаму любоўнаму пачуццю.

Велічнае, чыстае і глыбокае каханне паказана ў пенталогіі І. Шамякіна “Трывожнае шчасце”. Маладыя, закаханыя адзін у аднаго Саша Траянава і Пятро Шапятовіч праходзяць праз цяжкія выпрабаванні (падполле, фронт, партызанская барацьба, аднаўленчы перыяд) і не страчваюць велічнага, чыстага і глыбокага пачуцця, якое вытрымала суровы жыццёвы экзамен [27, с. 58].

Такім чынам, тэма кахання з’яўляецца скразной для ўсёй беларускай літаратуры. Кожны пісьменнік і паэт па-свойму апісаў і ўвасобіў яе ў сваёй творчасці. Каханне з’яўляецца неад’емнай часткай чалавечага жыцця. Індывідуальнае і непаўторнае, яно выяўляецца ў шматлікіх формах і іпастасях, лічыцца жыццёвай цэннасцю, асновай жыцця.

## 1.2 Феномен кахання ў творчасці І. Шамякіна

У беларускай літаратуры І. Шамякіна з`яўляецца самабытнай і арыгінальнай індывідуальнасцю па сіле мастацкага дару і па значнасці напісанага. У пісьменніка свой голас, сваё бачанне свету, свой мастацкі слоўнік.

Пра асаблівасць і геніяльнасць прозы І. Шамякіна гаварылі многія даследчыкі, а таксама іншыя пісьменнікі. У. Гніламёдаў, адзначаў: “Пра творчасць

Шамякіна і яго самога можна гаварыць бясконца, ды ўсё роўна сказанае не вычэрпае яго сутнасці” [9, с. 45].

Вядомы беларускі літаратуразнавец А. Бельскі назваў І. Шамякіна “прапаведнікам духоўнасці і чалавечнасці” [4, с. 10]. Ён высока ацэньвае творчую спадчыну класіка, прасякнутую творчым духам, існасцю, пэўнай неўтаймаванай непасрэднасцю, а не проста скрупулёзным веданнем законаў мастацкай творчасці, вызначальную глыбінёй прадстаўленых пісьменнікам вобразаў [5, с. 24].

М. Тычына адзначае, што “Іван Шамякін як мастак слова цікавы перш за ўсё выдатным уменнем увасабляць у мастацкіх творах менавіта гэты чалавечы змест усяго існага, уласна чалавечы бок вялікіх падзей…” [25, с. 361].

Творы Івана Шамякіна – з'ява надзвычай непаўторная і унікальная. Яна эмацыянальна і шматпланава ўзнаўляе навакольны свет, адлюстроўвае прыгажосць роднай зямлі, пафас стваральнай працы. У творчасці паэта ўзнімаецца шмат тэм і праблем, актуальных нават і ў сучаснасці [6, с. 82].

І. Шамякін у сваіх творах даследаваў сучаснае яму жыццё, людзей, лёс чалавека, яго псіхалогію. Асаблівую ўвагу надзяляў паказу ролі кахання, сям’і, дзяцей у жыцці чалавека, і асабліва ў лёсе жанчыны.

Безумоўна, на творчую індывідуальнасць паэта паўплываў яго жыццёвы шлях. І. Шамякін быў прыкладным сем’янінам, вельмі кахаў сваю жоку, дзяцей, гэта не магло не адбіцца на творчай спадчыне паэта: тэма кахання з`яўляецца скразной для яго творчасці. У шматлікіх творах яго паказана каханне, пачуцці, створаны лепшыя жаночыя вобразы [13].

У аўтабіяграфічнай аповесці “Слаўся, Марыя!”, якую ён сам вызначыў як “гісторыю кахання, любові, жыцця”, прысвечанай яго жонцы Марыі Філатаўне, аўтар зазначае, успамінаючы гісторыю напісання многіх твораў: “Лёс жанчыны – во аснова” [12, с. 210]. Эпіграфам да гэтага твора І. Шамякін нездарма абірае словы Л. Талстога: “Каханне – даброта, быць каханым – шчасце. Якое дзіўнае і

трапнае слова, што муж і жонка (калі яны жывуць духоўна) не двое, а адзіная істота” [7, с. 14].

І. Шамякін стварыў шырокую галерэю розных вобразаў у шматлікіх гісторыях кахання і жыцця. І большасць яркіх, запамінальных характараў беларускіх жанчын І. Шамякін “спісаў” з вобраза сваёй любімай жонкі Марыі Філатаўны, з якой пражыў разам да яе смерці 58 гадоў. І. Шамякін лічыць, што менавіта жонка дапамагала яму тварыць: “Каханне наша дапамагло мне стаць пісьменнікам” [2, с. 268]. Менавіта жонка дапамагла яму выжыць: “Яна асцерагала мяне больш за паўстагоддзя! Ад злых людзей, ад хвароб, ад літаратурнай багемы, ад захаплення славай і ад celyнага глупства” [15, с. 368]. Марыя Філатаўна, як успамінае сам аўтар у “Слаўся, Марыя!”, стала прататыпам Сашы Траянавай з пенталогіі “Трывожнага шчасця”, Таццяны Маеўскай з “Глыбокай плыні”, фельчаркі Тасі Батрак з рамана “Вазьму твой боль”, Полі з “Атлантаў і карыятыдаў”; асобныя рысы жонкі аўтар увасобіў у вобразах Вольгі Ляновіч з “Гандляркі і паэта”, Надзеі са “Снежных зім”, Галіны Адамаўны, жонкі доктара Яраша, з рамана “Сэрца на далоні” і інш.

У творчасці І. Шамякіна вялікая ўвага надаецца першаму пачуццю закаханасці. Менавіта яму прысвечаны многія апавяданні і аповесці. Герой апавядання “Вясновымі днямі” Яўмен працуе на трактары і разам са сваім напарнікам накіраваны ў дапамогу суседняму калгасу. Там, у калгасе, ён сустракае дзяўчыну Надзю, у якую шчыра і па-сапраўднаму закахаўся. Першае глыбокае пачуццё выклікае такі эмацыянальны ўсплёск у душы героя, што непасрэдным чынам уплывае на эфектыўнасць працы [1, с. 174]. Маральна-грамадзянскае і эмацыянальна-ўзроставае сталенне маладога чалавека падаецца аўтарам як выпрабаванне на чалавечнасць і высакародства, а ў выніку атрымліваецца цэласнае чалавеказнаўчае даследаванне, дзе галоўную ролю адыгрываюць характар, сэрца і добрыя пачуцці галоўнага героя. Нягледзячы на маладосць, Яўмен праяўляе ў сваіх паводзінах сапраўдную духоўную сталасць: калі ён

зразумеў, што пачуцці яго каханай да Валянціна сапраўдныя, шчырыя, саступае суперніку.

У апавяданні “Першае спатканне” паказана нараджэнне першага пачуцця. Уся ўвага пісьменніка засяроджана на перажываннях галоўнага героя, на эмацыянальна-псіхалагічным стане закаханага Сашы. І. Шамякін падкрэслівае звычайнасць перажыванняў галоўнага героя, паўсядзённасць, духоўную сутнасць жыцця чалавека [8, с. 42]. Рамантычныя мары героя, яго душэўная ўзнёсласць, натуральнасць, непасрэднасць, яснасць і жывасць апавядання, рэалістычная дакладнасць апісанняў надаюць асаблівую мастацкую адметнасць гэтаму твору, выводзяць у шэраг лепшых твораў на тэму кахання. У гэтым творы бачна тонкае разуменне вытокаў пачуцця закаханасці, прадчуванне яго.

Асабіста перажытае падмацоўвала праўдзівасць апавяданняў І. Шамякіна, спавядальная інтанацыя – непасрэднасць і сапраўднасць пачуццяў. Творы пісьменніка на тэму кахання асабліва прываблiваюць тым, што аўтарскае, асабіста перажытае перадаецца не толькі праз падзеі, непасрэдным удзельнікам якіх быў сам аўтар, але і праз надзвычайную інтэнсіўнасць унутранага духоўнага жыцця, маральныя пошукі лірычнага героя твораў, яго перажыванні [16, с. 45].

Безумоўна адным з лепшых твораў, у якіх адлюстроўваецца каханне, з’яўляецца пенталогія “Трывожнае шчасце”. Іван Шамякін стварыў “мастацкую біяграфію свайго пакалення, якая ўвабрала агульнае, тыповае і асобнае, індывідуальнае. Прычым агульнае непасрэдна вынікае з канкрэтных чалавечых лёсаў, прыватнага жыцця маладых герояў” [10, с. 21].

У першай аповесці паказана светлая пара юнацтва, лепшыя гады, першыя высокія пачуцці, спробы самастойных крокаў па жыццёвым шляху, спатканні. У аповесці паказана развіццё адносін паміж галоўнымі героямі – Сашай Траянавай і Пятром Шапятовічам. Саша працуе фельчаркай у беларускай вёсцы, Пётр – студэнт тэхнікума. Аўтар распавядае аб іх знаёмстве і пачатку кахання. Абое яшчэ зусім юныя, амаль дзеці. Гэта адлюстроўваецца і ў іх паводзінах: шмат мілай

непасрэднасці, юнацкага максімалізму, эмацыянальнасці, душэўнай узнёсласці, змяняецца настрой, падзеі, поры года. Не ператвараецца толькі адно – каханне. На пачатку твора яно толькі ўзгаралася ў іх сэрцах. І пад уплывам падзей, недарэчнасцей, радасных хвілін успыхвала ўсё мацней. Аўтар паказвае прыгажосць і непаўторнасць першага кахання, тонка перадае душэўныя перажыванні і згрызоты маладых герояў. Пятра і Сашу зблізжае, роднiць шчырае, адданае, узаемнае пачуццё, яны, здаецца, створаны адно для аднаго, не могуць існаваць паасобку. Адносіны герояў пазбаўлены халоднай рацыяналістычнасці і разліку. Яны былі неверагодна шчаслівыя адзін з адным, але пры гэтым адчувалі нарастаючую трывогу ў свеце: Германія напала на Польшчу, Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Беларусі. Паступова героі сталеюць, на змену ружовым уяўленням і нявопытнасдi прыходзіць сур'ёзны і ўдумлівы погляд на жыццё. У мінулым застаюцца гарачлівыя ўчынкі, дробязныя непаразуменні і крыўды. Саша і Пятро пачынаюць глыбей адчуваць адно аднаго: іх пачуццё становіцца глыбокім і сталым. Каханне, якое прыносіла сустрэчы і расстанні, падводзіць маладых герояў да таго, каб прыняць важнае і адказнае рашэнне пажаніцца.

У далейшых аповесцях паказана развіццё пачуццяў герояў, тыя выпрабаванні, праз якія ім прыйшлося прайсці і захаваць свае пачуцці, якія пераўтварыліся ў сталае і глыбокае каханне [17, с. 142]. Аповесць “Начныя зарніцы” паказвае жыццё Сашы і іх дачкі ў акупаванай вёсцы. Маладая жанчына ўвесь час хвалюецца за лёс маленькай дачкі, за Пятра, які ваюе з ворагам недзе на поўначы. Яна ўступае у падпольную арганізацыю, лечыць камісара партызанскага атрада Лялькевіча, дапамагае у яго нялегкай дзейнасці. Нянавісць да ворага, клопат і трывога за дзіця, за мужа, за меньшага брата дапамагаюць ёй адолець страх, знасці сілы для барацьбы. Нягледзячы на ўсе выпрабаванні, у гэты суровы час Саша захоўвае веру ў каханне, вернасць мужу, пяшчоту да маленькай дачкі.

Аповесць “Агонь і свет” паказвае жыццё Пятра ў часы вайны. Яна мае форму дзенніка, які вядзе герой. Падзеі ў аповесці храналагічна ахопліваюць

перыяд ад самага пачатку вайны да чэрвеня 1942 года, калі галоўны герой пасля ранення ачуньвае ў шпіталі. За гэты час Шапятовіч прайшоў суровую франтавую школу і навучыўся ваяваць, у экстрэмальных абставінах сустрэўся са смерцю, нават мог загінуць, перажыў страты і цяжкія, напружаныя моманты, у выніку – загартаваўся і пасталеў. Апрача гэтага, Пятро зведаў цану баявой дружбе, сапраўднаму сяброўству, чалавечнасці і сумленнасці. У аповесці паказаны перажыванні Пятра, трывога за лёс Сашы і дачкі.

У аповесці “Пошукі сустрэчы” паказана вяртанне Пятра дадому. Адносіны некалі так моцна закаханых людзей далі раскону, аднак Пятро і Саша прайшлі цяжкую дарогу да прымірэння, сямейнай згоды і яднання, здолелі захаваць вернасць сабе, не далі абставінам зруйнаваць іх пачуцці.

У заключнай аповесці “Мост” Пятро і Саша, у шчаслівае каханне якіх жорстка ўварвалася вайна і на доўгія гады параскідала па свеце, зноу разам. Яны ўступаюць у новую паласу жыцця. Пісьменнік паказвае, як пасля вайны людзі вярталіся да працы, уключаліся ў адбудову вёскі, наладжвалі побыт: Пятро працуе настаунікам, Саша – лечыць людзей. Яны – шчаслівыя, што ў час вялікага гора былі разам з народам, што у агульнай перамозе над ворагам ёсць іх доля. Героі працуюць, гадуюць дачку, дапамагаюць хутчэй загаіцца жахлівым ранам вайны. Іх пауццё глыбокай унутранай блізкасці мацнее з кожным днём: яны аднолькава адчуваюць жыццё, аднолькава ацэньваюць падзеі.

Такім чынам, тэма кахання займае не асноўную, але значную ролю у творчасці І. Шамякіна. Вобразы герояў твораў глыбокапрачулыя, выверaныя, выпакутаваныя. У творах паказваюцца перажыванні і пачуцці, асабіста перажытыя, якія падмацоўваюць праўдзівасць апавяданняў аўтара.

# ГЛАВА 2
# АСАБЛІВАСЦІ АДЛЮСТРАВАННЯ КАХАННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ І. ШАМЯКІНА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПЕНТАЛОГІІ “ТРЫВОЖНАЕ ШЧАСЦЕ”)

## 1.1 Аповесць “Непаўторная вясна” як гімн юнацкаму каханню

## 2.2 Вернасць і абавязак у аповесцях “Начныя зарніцы” і “Агонь і снег”

## 2.3 Асаблівасці адлюстравання кахання ў аповесцях “Пошукі сустрэчы” і “Мост”

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Мэтай курсавога даследавання быў аналіз адлюстравання кахання ў творчасці Івана Шамякіна на прыкладзе пенталогіі «Трывожнае шчасце». Падчас даследавання былі вырашаны наступныя задачы: вызначана месца тэмы кахання ў беларускай літаратуры; разгледжаны феномен кахання ў творчасці І. Шамякіна; ахарактарызаваны асаблівасці адлюстравання кахання ў пенталогіі «Трывожнае шчасце».

Было ўстаноўлена, што тэма кахання займае не асноўную, але значную ролю ў творчасці Івана Шамякіна. У сваіх творах пісьменнік даследаваў сучаснае яму жыццё, людзей, лёс чалавека, яго псіхалогію. Асаблівую ўвагу надзяляў паказу ролі кахання, сям'і, дзяцей у жыцці чалавека, і асабліва ў лёсе жанчыны.

Пенталогію «Трывожнае шчасце» называюць своеасаблівым літаратурным Евангеллем ад беларускага пісьменніка-гуманіста пра духоўную годнасць і трываласць сапраўдных людзей, іх глыбокую адданасць вечным каштоўнасцям жыцця. У аповесці "Непаўторная вясна" Іван Шамякін паказвае паказвае сапраўднае пачуцце маладых людзей, чыстае, шчырае, а таксама яго эвалюцыю – ад простай закаханасці праз рэўнасць і разлуку да сталага пачуцця. У аповесцях "Начныя зарніцы" і "Агонь і снег" адлюстроўваюцца пачуцці і перажыванні герояў падчас вайны, падчас розных выпрабаванняў. Саша захавала сваю вернасць перад каханым, нягледзячы на ўсе абставіны яе жыцця ў акупацыі. Яна з годнасцю прайшла праз усе выпрабаванні: не пайшла за абставінамі, выстаяла, захавала вернасць. Пятро зламаўся: выпрабаванне цяжкімі абставінамі ён не прайшоў, здрадзіў жонцы, нягледзячы на тое, што захаваў пачуцці да яе. У аповесцях "Пошукі сустрэчы" і "Мост" пісьменнік стварае карціны пасляваеннага аднаўлення, а таксама аднаўлення пачуццяў герояў, узмацнення пачуцця глыбокай унутранай блізкасці герояў, якія аднолькава адчуваюць жыццё, аднолькава

ацэньваюць падзеі. Героі прайшлі ўсе выпрабаванні жыццём, засталіся вернымі сабе і свайму пачуццю, захавалі яго.

У пенталогіі “Трывожнае шчасце” Іван Шамякін выступае выдатным псіхолагам і тонкім лірыкам, які добра адчуваў каштоўнасць шчырых і цёплых чалавечых узаемаадносінаў, паказваючы іх у сваіх творах.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Адамовіч, А. М. Багацце мастацкіх індывідуальнасцей. І. Шамякін / А. М. Адамовіч // Культура творчасці: літаратурна-крытычныя артыкулы / А. М. Адамовіч. – Мінск: Дзяржвыд БССР, 1959. – С. 171–175.
2. Баруздзін, С. А. Адчуванне часу: Творчасць І. Шамякіна / С. Баруздзін; перевод з рускай А. Марціновіча // Братэрства'90: літаратурны зборнік. – Мінск: Маст. літ., 1990. – С. 265–270.
3. Бельскі А. І. Беларуская лірыка кахання // София: электрон. науч.-просветит. журн. – 2021. – № 1. – С. 28–33.
4. Бельскі, А. І. Прапаведнік духоўнасці і чалавечнасці: сучаснасць у мастацкім асэнсаванні І. Шамякіна / А. І. Бельскі // Роднае слова. – 1996. – № 1. – С. 9–24.
5. Бельскі, А. І. Чалавек – час – мараль у прозе І. Шамякіна пра сучаснасць / Алесь Бельскі // Бел. мова і літ. – 2005. – № 1. – С. 3–8; № 3. – С. 22–28.
6. Васілевіч, А. С. Змястоўная лічба: да 60-годдзя з дня нараджэння І. Шамякіна / А. С. Васілевіч // Люблю, хвалююся – жыву: нататкі, эсэ, роздум. – Мінск: Маст. літ., 1986. – С. 81–86.
7. Галоўка, С. Жыццёвая плынь Івана Шамякіна / С. Галоўка // Беларуская думка. – 2016. – № 2. – С. 12–19.
8. Гардзіцкі, А. К. І. Шамякін. Творчасць / А. К. Гардзіцкі // Пра майстэрства дэталі / Аляксей Гардзіцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – С. 41–45.
9. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; Навук.рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мн. : Беларуская навука, 1999.
10. Гніламёдаў, У. Пісьменнік дзвюх эпох / У. Гніламёдаў // Шамякін, І. Збор твораў: у 23 т. / рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск: Маст. літ., 2010. – Т. 1. – С. 3-44.

11. Драздова, З. У. Каханне і сям'я: дыялогі ў творах Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Івана Мележа, Уладзіміра Дамашэвіча, Івана Шамякіна, Генрыха Далідовіча / Зінаіда Драздова // Роднае слова. – 2003. – № 1. – С. 27–30.
12. Егарэнкава, Г. І. Аддай герою сэрца!: Чалавек у раманах Івана Шамякіна / Галіна Егарэнкава // Полымя. – 1979. – № 12. – С. 200–224.
13. Іван Шамякін – пісьменнік, акадэмік, грамадскі дзеяч. Да 100-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна : матэрыялы адкрытага навук.-практ. семінара, Рэсп. Беларусь, Мінск, 18 лют. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Т. І. Шамякіна (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2021.
14. Каваленка, У. П. Сюжэтна-падзейная аснова пенталогіі "Трывожнае шчасце" І. Шамякіна / У. П. Каваленка // Беларуская літаратура. Вып. 6. – Мінск: Выд-ва БДУ імя У. І. Леніна, 1978. – С. 112–120.
15. Каваленка, В. А. Шамякін Іван Пятровіч / В. А. Каваленка, С. С. Лаўшук // Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 17. Хвінявічі – Шчытні / рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2003. – С. 367–368.
16. Кавалюк, А. С. Гісторыя беларускай літаратуры другой паловы XX ст.: вучэбна-метадычны дапаможнік: у 3 ч. / А. С. Кавалюк. – Ч. 1. – Брэст, 2008. – 262 с.
17. Карпаў, У. Проза Івана Шамякіна / У. Карпаў // Полымя. – 1953. – № 3. – С. 139–158.
18. Макмілін, А. Беларуская літаратура ў 50-60-я гады XX стагоддзя: Манаграфія / Пер. з англ. А. Літвіноўскай / А. Макмілін. – Мн.: «Беларускі кнігазбор», 2001. – 332 с.
19. Марціновіч, А. А. Народны па прызванню: [з нагоды юбілею І. Шамякіна] / А. А. Марціновіч // Беларуская думка. – 1996. – № 1. – С. 181–189.
20. Можейко, М. А. Любовь как феномен культуры / М. А. Можейко // Социология. – 2016. – № 3. – С. 85–92.

21. Мушынскі, М. І. Летапіс жыцця і творчасці Івана Пятровіча Шамякіна / М. І. Мушынскі. – Мінск: Беларуская навука, 2020. – 683 с.
22. Навуменка, І. Я. Трывожнае шчасце пакалення / Іван Навуменка // Кніга адкрывае свет: літаратурна-крытычныя артыкулы / Іван Навуменка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. – С. 178–182.
23. Разанаў, І. Вывучэнне пенталогіі “Трывожнае шчасце” / І. Разанаў // Народная асвета. – 1973. – № 3. – С. 66–71.
24. Тлумачальны слоунік беларускай мовы / І. М. Гайдукевіч, П. П. Шуба. – 5-е выд., перaправ. і дап. – Мінск: Народная асвета, 2001. – 346 с.
25. Тычына, М. А. Творы пра вайну Івана Шамякіна / М. А. Тычына // Народ і вайна. – Мінск: Народная асвета, 2015. – С. 360-364.
26. Шамякін, І. Трывожнае шчасце / І. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 1978. – 607 с.
27. Яніцкі, М. І. Каштоўнасныя прыярытэты маладога пакалення ў пенталогіі І. Шамякіна “Трывожнае шчасце” / М. І. Яніцкі // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя філалагічных навук. – 2008. – № 1. – С. 58–61.